УДК 947.6(04) «18/19» Немцевич

*Анатоль Гладышчук*, *загадчык кафедры фізікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, кандыдат фіз.-мат навук; г. Брэст, РБ.*

# СКОКАЎСКАЕ РЭХА

## Крохі мінуўшчыны

Якім чынам, дзесьці на пачатку XX стагоддзя, вядомы польскі гісторык і публіцыст Аляксандр Краўшар апынуўся ў Скоках – невядома, але тое, што ён у скокаўскім палацы дакрануўся да памятных рэчаў Юльяна Ўрсын Нямцэвіча і пра гэта напісаў у 1913 годзе, прыадкрывае нейкім чынам таямніцу скокаўскага скарбца. А. Краўшар трапна прыкмеціў у сваёй кнізе «Крохі мінуўшчыны»: «Не патрэбна сваёй увагаю абыходзіць сямейныя архівы, якія ўтойваюцца ў шляхецкіх дварах і дворыках, у якіх пераважна хаваецца бытавая гісторыя выдатных мужоў, якія ўплывалі на лёсы грамадства пазітыўна альбо адмоўна.»

Найбольш у гэты адзіны візіт да Скокаў Аляксандра Краўшара цікавілі рэчы, якія належалі менавіта Юльяну Ўрсын Нямцэвічу. Абмежаваны часам і магчымасцямі зрабіць добрыя фотарэпрадукцыі таго, што ён у Скоках убачыў, А.Краўшар тым не менш падараваў нам, не ведаючы гэтага, рэдкі выпадак убачыць у копіях і пачуць аб тым, што, імаверна, страчана назаўсёды. А можа, ён быў і апошнім, хто дакрануўся да тых рарытэтных рэчаў, якія б сёння мелі дзяржаўную каштоўнасць. Такая сумная доля беларускай гістарычнай спадчыны.

Вядома, што пасля вызвалення з вязняў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Санкт-Пецярбургу Юльян Нямцэвіч пагадзіўся разам з Тадэвушам Касцюшкам ад'ехаць у Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе пазнаёміўся з першым прэзідэнтам ЗША Джорджам Вашынгтонам. У скокаўскім сямейным архіве захоўваўся ліст, напісаны ўласнаручна Д.Вашынгтонам да Юльяна Нямцэвіча 18 чэрвеня 1798 года з Моўнт Вернона, які быў, як заўважае А.Краўшар, напісаны «ў словах не толькі ўпрыгожаных далікатнасцю да чужаземца, але авеяных узнёслымі пачуццямі сімпатыі да тагачаснага лёсу яго грамадства».

Трэба меркаваць, што А.Краўшар быў апошнім, хто трымаў у руках і чытаў гэты ліст ад піянера амерыканскай дэмакратыі. Сам ліст, імаверна, праглядваецца на здымку, які захаваўся ў Францыі, сярод іншых памятных рэчаў Юльяна, але, на жаль, тэксту ліста на тым старым здымку прачытаць нельга.

Са слоў А. Краўшара ў скокаўскім скарбцы захоўваўся да Першай сусветнай вайны шчодры збор мноства аўтографаў, пакінутых Юльяну Нямцэвічу выдатнымі дзеячамі Амерыкі і Заходняй Еўропы ў час яго пражывання за мяжою, якія праліваюць святло на яго асабістыя кантакты з 1798 года да апошніх хвілін яго жыцця ў 1841 годзе. Трымаючыся алфавітнага парадку ўслед за А. Краўшарам пералічым імёны найбольш вядомых асобаў эпохі Юльяна Ўрсын Нямцэвіча, з якімі ён падтрымліваў асабістыя кантакты:

– **княжна д'Абрантэс (d'Abrantès)** – Лаура д'Абрантэс (1784-1838), герцагіня, сям'я яе бацькоў сябравала з сям'ёй Банапартаў. У іх доме ў 1785 годзе памёр бацька Напалеона. Былі поўнасцю даведзены да галечы ў час рэвалюцыі, ратуючыся, пераехалі да Парыжа, дзе дапамагалі маладому генералу Банапарту. Ва ўзросце 16 гадоў Лаура пайшла замуж за блізкага сябра Напалеона генерала Жуно, губернатара Парыжа. Не мела пасагу, таму Напалеон падараваў ёй дом на Елісейскіх палях і 100 тысяч франкаў. Пасля смерці мужа ў 1813 годзе напісала 18 тамоў успамінаў эпохі Напалеона;

– **паэт Беранжэ (Béranger)** – П'ер Жан Беранжэ (1780-1857), французскі паэт і складальнік песень, вядомы перш за ўсё сваімі сатырычнымі творамі;

– **лорд Бульвэр (Bulwer)** – Эдвард Джордж Бульвэр Літтан (1803-1873), англійскі драматург са знатнай арыстакратычнай сям'і; п'есы яго карысталіся вялікай папулярнасцю;

– **паэт Кэмпбэл (Campbell)** – Томас Кэмпбэл (1777-1844), англійскі паэт, паходзіў са знатнага, але збяднелага, арыстакратычнага роду, дэбютаваў паэмай «Радасці надзеі», у якой рэзка выступіў супраць жахаў вайны і падзелу Польшчы, чым адразу набыў шырокую вядомасць;

– **Тадэвуш Чацкі (Czacki)** – (1776-1813), польскі гісторык і дзеяч культуры, ініцыятар складання гідраграфічнай карты Польшчы і ВКЛ, апрацаваў таксама нумізматычны каталог;

– **скульптар д'Анжэ (d'Angers)** – Давід д'Анжэ, П'ер Жан (1788-1856), французскі скульптар і медальер, які ўвекавечыў аблічча шмат якіх знакамітых гістарычных дзеячаў у статуях, бюстах і медалях. Сярод яго прац – барэльефы франтона Пантэона ў Парыжы, помнік Гутэнбергу ў Страсбургу, Джэферсону ў Вашынгтоне і шмат іншых, а таксама шматлікія бюсты і медалі; працай ягонай рукі з'яўляецца і медаль нашага знакамітага земляка Юльяна Ўрсын Нямцэвіча;

– **генерал Дэмбінскі (Dembiński)** – (1791-1864), польскі генерал, адзін з кіраўнікоў паўстання 1830 года, пасля паразы паўстання эміграваў у Францыю, падтрымліваў партыю князя Чартарыйскага;

– **Дудлей Сцюарт (Stuart)** – (1803-1854), брытанскі ліберальны палітык, быў апантаным абаронцам незалежнасці Польшчы і выступаў супраць палітыкі Расіі ва Усходняй Еўропе;

– **генерал Дварніцкі (Dwernicki)** – Юзэф Дварніцкі (1779-1857), польскі генерал, нарадзіўся ў шляхецкай сям'і на Падоле, вучыўся ў рыцарскай школе ў Варшаве, ваяваў на баку Напалеона, у тым ліку і ў кампаніі 1812 года; пасля падзення Напалеона і ўтварэння Каралеўства Польскага вярнуўся з войскам у Польшчу, дзе працягваў вайсковую службу. Прыняў актыўны ўдзел у якасці генерала ў Лістападаўскім паўстанні 1830 года. Пасля паразы паўстання выехаў у эміграцыю ў Парыж, потым у Лондан, у 1848 годзе атрымаў дазвол вярнуцца ў Польшчу;

– **Дзялынскі (Działyński)** – Ігнацій Дзялынскі (1754-1797), палкоўнік, адзін з першых, хто не падпарадкаваўся загаду раззброіць

свой полк і выступіў самастойна ў 1794 годзе супраць чужаземцаў, быў арыштаваны на мяжы з Аўстрыяй і сасланы ў Сібір;

– **Фэргюсон (Ferguson)** – Адам Фэргюсон (1723-1816), шатландскі філосаф і гісторык;

– **лорд Грэй (Grey)** – Чарльз Грэй (1764-1845), граф, нарадзіўся ў сям'і легендарнага военачальніка брытанскай імперыі лорда Чарльза Грэя, самы папулярны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў 1830-1834 гадах. У 1832 годзе поўнасцю змяніў структуру брытанскага парламенту: менавіта Чарльз Грэй-сын ініцыяваў спосаб галасавання, які існуе і зараз: адзін чалавек – адзін голас. Аднойчы, як прэм'ер-міністр, ён быў у Кітаі і выратаваў жыццё кітайскага Мандарына, які падараваў яму за гэта незвычайны, з прыемным водарам чай разам з рэцэптам. Сёння чай Эрл Грэй з'яўляецца адным з самых папулярных у свеце і прадаецца больш як у 90 краінах свету;

– **Гамільтон (Hamilton)** – Аляксандр Гамільтон (1757-1804), давераны сакратар Д.Вашынгтона ў час вайны за незалежнасць ЗША, у 1780-х гадах змагаўся за прынядце федэральнай канстытуцыі, быў арганізатарам і першым кіраўніком дэпартамента казны. У 1795 годзе адышоў ад грамадскіх спраў, загінуў ад раны, атрыманай у паядынку на палітычнай глебе;

– **Джонсан (Johnson)** – Самуэль Джонсан (1709-1784), часта ўпамінаецца як доктар Джонсан, адна з самых вядомых англійскіх фігур, паэт, біёграф, лексікограф і крытык англійскай літаратуры. Ён быў таксама вялікай дасціпнасцю англійскай прозы. Доктар Джонсан пасля Шэкспіра ў Англіі найчасцей цытуецца.

– **Кін (Kean)** – Сюзана Кін, народжаная Лівінгстон, адна з першых фамілій у Нью-Йорку, мела сына Пятра ад першага шлюбу з амерыканскім генералам Кін, аўдавела, пасля чаго пайшла замуж за Юльяна Ўрсын Нямцэвіча. Яны пабраліся шлюбам у 1800 годзе ў чэрвені ў Элізабэттаўне. Вось як яе апісваў сам Юльян: «...прыгожага росту, бландзінка, блакітныя вочы, белая, больш прыгожая і прыстойная, чым цудоўная; шмат чытала і памятала, прыемная ў мове, дасціпная ў адказах.»

– **генерал Князевіч (Kniaziewicz)** – Кароль Ота Князевіч (1762-1842), з беларускай шляхты, вучыўся ў рыцарскай школе ў Варшаве разам з Юльянам Нямцэвічам, сябравалі ўсё жыццё. У

бітве каля Мацяёвіцаў у паўстанні 1794 года камандаваў у чыне генерал-маёра левым крылом, трапіў у палон. Удзельнічаў у баявых дзеяннях на баку Напалеона як генерал брыгады. Пасля выхаду ў адстаўку адмовіўся ад прапановы А. Чартарыйскага і імператара Аляксандра І стварыць польскую армію ў Расійскай імперыі. У 1812 годзе зноў прыняў дывізію ў арміі Напалеона, ваяваў пад Смаленскам, Барадзіном, у бітве на Бярэзіне прыняў камандаванне корпусам. У знак пратэсту супраць польскай палітыкі Напалеона зноў выйшаў у адстаўку. У час паўстання 1830 года выехаў у Парыж, дзе заставаўся да канца жыцця. Пахаваны разам з Юльянам Нямцэвічам на могілках дэ Шампо ў парыжскім прадмесці Монтмарансі;

– **Ля Фаэт (La Fayette)** – Мары Жозэф Поль Іў Рок Жыльбер (1757-1834), маркіз, французскі палітычны дзеяч, ваяваў за незалежнасць ЗША на баку Б.Франкліна, пасля ўзяцця Бастыліі быў камандуючым Нацыянальнай гвардыі, выступіў супраць якабінцаў, з Напалеонам не стаў супрацоўнічаць;

– **Ля Марцін (La Martine)** – Альфонс Мары дэ Луі (1790-1869), французскі паэт-рамантык, палітычны дзеяч, гісторык;

– **Лівінгстон (Livingstone)** – Эдвард Лівінгстон (1764-1836) і Генры Бракхолст Лівінгстон (1757-1823), амерыканскія юрысты, першы быў паслом ЗША ў Парыжы, другі – суддзёю найвышэйшага Нью-Йоркскага суда;

– **Станіслаў і Густаў Малахоўскія (Maĺachowski)** – Малахоўскі Станіслаў (1736-1809), польскі палітычны дзеяч, у 1788 годзе быў аднагалосна выбраны маршалкам Чатырохгадовага сойма, адзін з аўтараў Канстытуцыі 3 мая 1791 года, пасля стварэння Варшаўскага герцагства быў старшынёю сената; пра Густава Малахоўскага нічога невядома;

– **Фрыдэрык Машынскі (Moszyński)** – (1737-1817), апошні ўсемагутны вялікі каронны маршалак у Польшчы з ласкі Таргавіцы ад Гарадзенскага сойма 1793 года і да паўстання 1794 года;

– **Антоні Астроўскі (Ostrowski)** – (1712-1784), архіепіскап гнезінскі, блізкі сябра караля Станіслава Панятоўскага, паходзіў з дробнай шляхты, вылучыўся дзякуючы ўласнай годнасці;

– **лорд Пальмэрстон (Palmerston)** – (1784-1865), вікант, англійскі палітычны дзеяч, міністр па ваенных справах, міністр замежных спраў, прэм'ер-міністр;

– **генерал Пац (Pac)** – верагодна, генерал-маёр Юзэф Пац (1736-1797), які актам паўстання 1794 года ў Вільні быў прызначаны членам Найвышэйшай літоўскай рады;

– **паэт Кандрат Рылееў (Rylejew)** – (1795-1826), рускі паэт-дзекабрыст, які іграў вядучую ролю пры падрыхтоўцы паўстання 14 снежня 1825 года, пакараны смерцю;

– **граф Эдвард Рачынскі (Raczyński)** – Эдвард Рачынскі-старэйшы (1786-1845), служыў у 1806-1809 гадах у напалеонаўскай арміі, сабраў вялікую калекцыю кніжак, якая сталі асноваю для стварэння бібліятэкі Рачынскіх у Познані ў 1829 годзе, быў прапагандыстам гігіенічнай адукацыі ў Вялікапольшчы і нават паставіў помнік грэчаскай багіні Гігіеі, аўтар і выдаўца гістарычных крыніц і спраў, піянер краязнаўчай літаратуры, дапамагаў фінансава пісьменнікам і вучоным;

– **Сапегі (Sapiehowie)** – Казімір Нестар Сапега (1750-1797), генерал літоўскай артылерыі, не меў да канца вызначанай пазіцыі на Чатырохгадовым сойме, крытыкуючы караля за прыхільнасць да Таргавіцы, падаўся ў эміграцыю да Дрэздэна, у час паўстання 1794 года вярнуўся на радзіму; Міхал Аляксандр Сапега (1730-1793), гетман польны літоўскі, вялікі канцлер ВКЛ з 1775 года, з 1792 года займаў пасаду маршалка Таргавіцкай канфедэрацыі ў Літве;

– **Талейран (Talleyrand)** – Шарль Марыс дэ Талейран-Перыгор (1754-1838), вядомы французскі палітык і дыпламат, міністр замежных спраў пры некалькіх рэжымах, пачынаючы з Дырэкторыі і заканчваючы ўрадам Луі-Філіпа. Імя «Талейран» зрабілася амаль намінальным для падкрэслення хітрасці, спрытнасці і беспрынцыповасці;

– **епіскап Вароніч (Woronicz)** – Ян Павел Вароніч (1757-1829), прымас Польскага каралеўства, епіскап Кракаўскі, польскі паэт, нарадзіўся на Валыні, блізка быў звязаны з Чартарыйскімі ў Пулавах, кантактаваў таксама з Таварыствам прыяцеляў навук;

– **Уладзіслаў Замойскі (Zamoyski)** – (1803-1868), пляменнік князя Адама Чартарыйскага, пачаў кар'еру ў якасці ад'ютанта вялікага князя Канстанціна, прыняў удзел у паўстанні 1830 года, пасля чаго эміграваў у Англію.

Усе пералічаныя асобы, хоць імёны шмат каго нам сёння ні аб чым не гавораць, падкрэслілі, як паведамляе нам А.

Краўшар – «у сваіх добразычлівых лістах пачуцці найглыбейшага прызнання і сімпатыі да вялікага пісьменніка і грамадзяніна. Не адзін праменьчык гістарычнай значнасці асвятляе тыя канфідэнцыяльныя шчырыя выказванні, якія зусім не маюць прэтэнзій да разгалошвання.»

Нічога не застаецца больш, як абмежавацца такой кароткай характарыстыкай лістоў, атрыманых Юльянам Нямцэвічам. Хутчэй за ўсё А.Краўшар не меў пэўнага часу для грунтоўнага даследавання і выхопліваў сваім пільным вокам найбольш цікавыя, на яго погляд, рэчы, якія захаваліся ў скокаўскім палацы. Так, ён не робіць пераліку твораў скокаўскай сямейнай карціннай галерэі, а толькі называе з іх чатыры творы, а менавіта: рэпрадукцыю партрэта Юльяна Нямцэвіча з часу, калі ён з'яўляўся сакратаром сената Варшаўскага княства, яго бацькоў – Марцэля Ўрсын Нямцэвіча і Ядвігу з Сухадольскіх, якую памылкова называе ў тэксце Зоф'яй, а пад малюнкам пазначае: Ева з Сухадольскіх, і таксама краявід Скокаў з толькі што пабудаваным каменным палацам з вежамі-алькежамі і касцёлам насупраць яго, і галандскім млыном на пярэднім плане. Хутчэй за ўсё гэтая акварэль належыць руцэ самога Юльяна Нямцэвіча, гэты краявід ён мог намаляваць у свой другі прыезд на канікулы ў Скокі, калі яшчэ вучыўся ў кадэцкай школе ў Варшаве, дзе маляванню яго вучыў немец Мюллер. Але трэба шчыра падзякаваць і за гэта Аляксандру Краўшару, таму што ён зрабіў фотарэпрадукцыі пералічаных рэчаў, якія змясціў у сваёй кнізе, што адназначна пацвярджае прыналежнасць іх да скокаўскага палаца.

Найбольшую цікавасць у А.Краўшара выклікаў памятны альбом акварэляў і гравюр, які належаў асабіста Юльяну Нямцэвічу і, верагодна, з'яўляўся яго спадарожнікам у вандроўках па свеце. Хутчэй за ўсё ў ім Юльян Нямцэвіч змяшчаў нейкія памятныя замалёўкі, падараваныя яму сучаснікамі альбо ім набытыя самастойна, а таксама свае ўласныя малюнкі. З уласцівай манерай выхопліваць толькі нешта вельмі каштоўнае А.Краўшар пералічвае толькі некаторыя з іх:

– рэдкі партрэт Дзіанісія Княжніна (можа быць, адзіная праўдзівая выява паэта);

– аўтапартрэт віленскага мастака Рустама (Rustem);

– сустракаем тут арыгінальны малюнак Лампега (Lampiego);

– пастаўлены партрэт вядомай мастачкі Анжэлікі Каўфман (Kaufmann);

– рэдкія арыгінальныя ўласнаручныя эскізы Ван Дэйка і Леанарда да Вінчы;

– дзве арыгінальныя акварэлі Аляксандра Арлоўскага;

– характэрны малюнак забавы ў шляхецкім дворыку невядомага алоўка.

Вось такі зусім няпоўны пералік вельмі каштоўнага памятнага альбома Юльяна Нямцэвіча. Але наракаць не будзем, дзякуй і за гэты пералік і за тое, што хоць дзвюх малюнкаў рукі сусветных славутасцяў ван Дэйка і Леанарда да Вінчы – былі зроблены фотарэпрадукцыі, якія, глядзіш, дзе-небудзь і «засвецяцца» (хутчэй за ўсё Юльян мог набыць іх у час сваіх вандровак у Італію).

Аляксандр Краўшар адзначае, што ў Скоках захоўвалася на той час мноства рэчаў, якія належалі асабіста Юльяну Нямцэвічу, і гэта зразумела, таму што да свайго малодшага брата Яна, які заставаўся жыць у Скоках, Юльян адносіўся з вялікай павагаю і любоў'ю і шмат якія свае рэчы ў кароткія візіты да Скокаў пакідаў тут, у палацы. Захаваўся здымак падарожнага бюро для пісання Юльяна Нямцэвіча, які таксама бачыў у Скоках А.Краўшар разам з яго ад'ютанскімі шліфамі, узнагародамі і гадзіннікамі, якія добра распазнаюцца на здымку з Францыі. Але самай каштоўнай з гэтага ўсяго з'яўляецца калекцыя залатых табакерак, якія яшчэ з дзяцінства інтрыгавалі Юльяна, і гэтую яго слабасць добра ведалі. Успомнім табакерку дзеда Аляксандра са смарагдамі і жураўлямі, якую ў хвіліну душэўнай слабасці аддаў бацька Юльяна Марцэлі пасля смерці дзеда Аляксандра ў Клейніках манаху-езуіту, які апекаваўся дзедам у апошнія дні яго жыцця. З вялікім жалем Юльян успамінаў гэты выпадак, прамаўляючы, колькі ён аддаў бы цяпер, каб тую табакерку вярнуць.

Прывызваленні Юльяна Нямцэвіча з вязняў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Санкт-Пецярбургу расійскі імператар Павел I яму таксама падараваў залатую табакерку са сваім профілем, якой Юльян часта карыстаўся, асабліва пры аўдыенцыях у Варшаве з вялікім князем Канстанцінам, братам Паўла I, у часы існавання

Польскага княства. Табакерка ад Напалеона Банапарта сведчыць аб тым, што ў Юльяна быў асабісты кантакт з французскім імператарам, на асабістыя кантакты ўказваюць і залатыя табакеркі ад двух першых амерыканскіх прэзідэнтаў Вашынгтона і Джэферсана. З мастаком Аляксандрам Арлоўскім у Юльяна маглі быць больш блізкія стасункі, і ён яму з нейкай нагоды падараваў табакерку з выявай Фарыса. Усё гэтае гістарычнае багацце разам са срэбранымі кубкамі, атрыманымі ад саксонскага караля Фрыдэрыка Аўгуста, і з памятнымі медальёнамі ад Варшаўскага таварыства прыяцеляў навук, бачыў яшчэ А.Краўшар перад Першай сусветнай вайною ў Скоках. Кубкі, як гэта не дзіўна, пазней апынуліся ў маёнтку Цецяруўка на Гарадзеншчыне, іх выпадкова знайшлі памежнікі, і зараз кубкі знаходзяцца ў Гарадзенскім гістарычна-археалагічным музеі. Які лёс бясцэнных табакерак – невядома. Але, можа, і яны пры нейкай нагодзе заблікуюць сваім гістарычным цяплом. Памятнае золата не павінна губляцца.

**Маім унукам**

Так адрасаваў свой манускрыпт апошні ўладальнік скокаўскай сядзібы Станіслаў Урсын Нямцэвіч, які ён пісаў ужо напрыканцы свайго жыцця ў Францыі. Як успамінае ў сваім лісце яго дачка Тэрэса Марыя Верыха з Урсын Нямцэвічаў, якая нарадзілася ў Скокаўскім палацы ў 1925 годзе, бацька звярнуўся неяк да яе і з сумным жалем прамовіў:

– Столькі пражыта, змагаўся, цярпеў, і ніхто аб тым памятаць не будзе...

У адказ дачка прапанавала яму напісаць пра тыя свае часы для яе сыноў і яго ўнукаў на памяць. Так яно тое ўсё і выйшла. Прасядзеў стары ўжо чалавек усю зіму за пісьмовым сталом, акрылены ўспамінамі свайго няпростага жыцця, якое запісаў у простых школьных сшытках, падараваных яму для гэтай мэты ўнукамі.

Успаміны гэтыя былі прызначаны толькі блізкім людзям, таму шукаць у іх літаратурнага ладу не патрэбна. Станіслаў Нямцэвіч пісаў так, як гэта складвалася ў яго галаве. Потым гэты рукапіс апрацаваў іх сваяк Антоній Сцешка, якому Тэрэса Верыха за гэта ўдзячна да канца свайго жыцця, як яна сама аб гэтым

паведамляе. І вось у кампутарным варыянце, на дыскетцы гэтыя ўспаміны ў маі 2002 годзе прыехалі разам з Тэрэсай Верыхай да Берасця і Скокаў, дзе яна падаравала іх усім Нямцэвічам, хто прыехаў на той з'езд, а ўжо ад Вітальда Ўрсын Нямцэвіча яны апынуліся апрацаванымі на маім пісьмовым стале ў Скоках, за што і Вітальду, і Тэрэсе вялікае і шчырае дзякуй!

Успаміны Станіслава Нямцэвіча адразу ж далі захапляльны імпульс даследавання нашай гістарычнай спадчыны ў Скоках, прынамсі, было адразу ж вызначана прызначэнне цаглянай калоны каля Скокаў на Рахвале і месца, дзе стаяў той самы драўляны з лістоўніцы дом, у якім нарадзіўся наш знакаміты Юльян Урсын Нямцэвіч.

Паспрабуем прасачыць уважліва за паведамленнямі Станіслава Нямцэвіча (ён быў жанаты на сваёй дваюроднай сястры Яніне, якая нарадзілася і вырасла ў Скоках), выказанымі ім на паперы, таму што ён яшчэ бачыў Скокаўскі палац добра ўладкаваным перад Першай сусветнай вайною, да разбуральных «бежанцаў».

...Гаварылася ўжо, што Ян Тытус дзесьці ў другой палове XIX стагоддзя завёў у Скоках адметную конегадоўлю, якую прадоўжыў яго сын, таксама Ян. У 1915 годзе скокаўскі табун англійскіх скакуноў складваўся прыкладна з трыццаці кабыл, не лічачы жарабят. Табун, як і ўсё іншае ў жніўні 1915 года пацягнуўся са Скокаў у кірунку Калугі, такі быў вызначаны яму маршрут, там напярэдадні рэвалюцыі 1917 года ён і быў знішчаны, як сведчыць аб тым Станіслаў Нямцэвіч, якому пра гэта паведамілі жыхары Скокаў пасля вяртання з «бежанцаў». На тым цудоўная і годная конегадоўля ў Скоках спынілася. Дзевяноста гадоў прайшло з таго часу.

...У кнізе Аляксандра Краўшара змешчана фотарэпрадукцыя партрэта Юльяна Ўрсын Нямцэвіча са скокаўскай сямейнай карціннай галерэі, як сакратара сената ў 1808 годзе. Станіслаў Нямцэвіч апавядае аб тым, як гэты партрэт апынуўся ў Скоках. Яшчэ калі Дымшовы валодалі Нэплямі на другім беразе Буга, да іх звярнуўся мясцовы поп, хутчэй за ўсё пасля паўстання 1863 года, калі касцёл быў пераўтвораны ў царкву, і паведаміў, што ў царкве знаходзіцца партрэт нейкага польскага святога, які ён гатовы ім перадаць. Дымшовы пазітыўна аднесліся да прапано-

вы і распазналі на партрэце Юльяна Ўрсын Нямцэвіча, партрэт якога па старадаўнім звычаі пасля яго смерці быў усталяваны ў касцёле ў Нэплях, якія Юльян часта наведваў. Пры зручным выпадку гэты партрэт быў перададзены Яну Тытусу ў Скокі, дзе партрэт знаходзіўся да 1915 года. У час «бежанцаў» партрэт Нямцэвічы забралі з сабою, ён быў моцна пашкоджаны, таму ў 1930 годзе яго былі вымушаны аддаць на рэстаўрацыю ў Варшаву. Калі Нямцэвічы пакідалі Скокі ў 1935 годзе і выязджалі да Францыі, гэты партрэт яны забралі таксама з сабою, дзе ён, верагодна, знаходзіцца і цяпер.

...Калі ўважліва разгледзець здымак абедзеннай залы ў партэры скокаўскага палаца, які прыслала Тэрэса Верыха з Францыі, то, заўважна, што з гэтай залы шкляныя дзверы вялі на тэрасу і далей у парк, таму можна лічыць, што сямейныя партрэты ў параднай зале размяшчаліся на паўночнай сцяне і добра асвятляліся праз паўднёвыя вокны і шкляныя дзверы. Добра таксама відаць, што ў верхнім радзе пад столлю знаходзіцца па чатыры партрэты направа і налева ад дзвярэй і яшчэ тры, з блікамі святла, размешчаны пад імі справа. Нехта рукою пазначыў па-польскі на здымку: «Pokój stolowy w Skokach: p.Samuel, p.Aleksander, p.Ahdrzej, p.Stanislaw, Jadwiga z Suchodolskich, p.Marceli, Tekla z Wyganowskich, p.Jan». Гэта дае магчымасць індэнтыфікаваць восем партрэтаў, якія да Першай сусветнай вайны знаходзіліся ў сталовай зале ў Скоках.

Але спачатку ўважліва прачытаем Станіслава Нямцэвіча, які, верагодна, па памяці пералічвае ў сваім манускрыпце гэтыя самыя сямейныя рэліквіі скокаўскай калекцыі карцін:

– Самуіл у даспехах, які стаіць на каленях перад крыжам і моліцца за Польшчу ў час шведскага нападу;

– Андрэй у чырвоным кунтушы;

– Марцэлі;

– Станіслаў у генеральскім мундзіры;

– Юльян;

– Ян, берасцейскі маршалак;

– Ядвіга з Сухадольскіх, жонка Марцэля;

– быў таксама партрэт продка дзядзькавай Зоф'і з Мазарак Стадніцкага, у мундзіры гвардыі лёгкай конніцы.

Невядома, чаму Станіслаў не пералічвае ўсіх партрэтаў у сталовай зале, магчыма, насамрэч гэта рабіў па памяці, таму што называе іх не ў той паслядоўнасці, як яны размяшчаюцца на здымку. Патрабуецца кароткае тлумачэнне да гэтага сціслага пераліку.

Самуіл Казімір (1600-1673) быў сынам Барбары Кміты і ваяваў са шведамі падчас Паўночнай вайны пад кіраўніцтвам Паўла Сапегі, які, верагодна, і падараваў яму Лявошкі каля Картуз-Бярозы. Як сведчыць К.Нясецкі, Самуіл Казімір Нямцэвіч быў пахаваны ў кляштары картэзіянцаў у Картуз-Бярозе, дзе яго парэшткі знаходзяцца дасюль. Гэты партрэт свайго прапрадзеда Юльян малым яшчэ бачыў у свайго дзеда Аляксандра ў Клейніках: «На трэцім партрэце прапрадзед мой Казімір Урсын Нямцэвіч, стольнік вялікамірскі, дзед дзеда майго. Намаляваны ён быў так: на каленях, са складзенымі рукамі, у дэліі кармазынавай, і моліцца перад столікам з распяццем.»

Потым, хутчэй за ўсё, Марцэлі перамясціў партрэт з Клейнікаў у скокаўскі палац, дзе ён знаходзіцца ў самым вуглу злева, але штось убачыць на здымку, на жаль, немагчыма.

Андрэй (1640) у чырвоным кунтушы – гэта прадзед Юльяна і бацька Аляксандра, які заснаваў радзіннае гняздо Нямцэвічаў у Нэплях каля Берасця. Гэты партрэт у параднай зале знаходзіўся другім злева ад дзверы.

Партрэт бацькі Юльяна – Марцэля – добра вядомы, таму што А.Краўшар зрабіў яго фотарэпрадукцыю, гэты партрэт таксама змешчаны ў першым томе «Успамінаў часоў маіх» Юльяна Ўрсын Нямцэвіча, выдадзеных у 1957 з наступным тлумачэннем: «Мастак невядомы. Марцэлі Ўрсын Нямцэвіч. З сямейнай галерэі ў Скоках. У адпаведнасці з рэпрадукцыяй у іканаграфічным архіве аддзела дакументацыі Народнага музея ў Варшаве.»

Добра вядомы і партрэт маці Юльяна, які таксама быў надрукаваны ў вышэй прыведзеных крыніцах з тым жа тлумачэннем, толькі ў А.Краўшара зроблены памылковы подпіс: «Ева з Сухадольскіх Нямцэвічава, маці Юльяна» замест правільнага, які значыцца ў Народным музеі ў Варшаве: «Ядвіга з Сухадольскіх Нямцэвічава».

Таму гэтыя два партрэты бацькоў даўно і добра вядомы, іх лёгка можна адрозніць на фотаздымку сталовай залы ў Скоках, дзе яны вісяць разам, справа ад дзвярэй.

Станіслаў у генеральскім мундзіры, гэта стрыечны брат Юльяна, з якім ён разам вучыўся ў кадэцкай школе. Станіслаў Урсын Нямцэвіч быў добра вядомы ў Расійскай імперыі, таму што займаў у 1816-1817 гадах пасаду гродзенскага грамадзянскага губернатара, маючы ранг сапраўднага стацкага радцы. Яго партрэт у зале вісеў першым злева ад дзвярэй.

Партрэт Яна (1762-1821), берасцейскага маршалка, роднага і любімага брата Юльяна, які ўсё сваё жыццё пражыў у Скоках, замыкае верхні рад карціннай галерэі. Разам з ім партрэт жонкі Яна – Тэклі з Выганоўскіх, але пра яго чамусьці Станіслаў Нямцэвіч нічога не паведамляе.

Таксама Станіслаў нічога не згадвае і пра партрэт дзеда Юльяна – Аляксандра, які вісеў трэцім ад дзверы злева, але ён адшукаўся у Калужскім мастацкім музеі, аб чым трохі пазней.

... У салонах наверсе, якіх было два ў скокаўскім палацы, як паведамляе ў сваім рукапісе Станіслаў Нямцэвіч, – «былі вельмі цудоўныя мазаічныя паркеты і некалькі карцін мастакоў: Фры Барталамеа «Маці Божая з Панам Ісусам у ружах», два – Тэнэрса, Бачыарэлі і адзін ван Дэйк.

Уважліва паглядзім на два фотаздымкі, падараваныя Тэрэсай Верыхай з Нямцэвічаў. У першым салоне бачым тры карціны. На дзвюх з іх нічога нельга заўважыць, а вось на самай большай карціне добра відны аголеныя торсы, якія могуць даць спецыялісту пэўныя падставы для меркавання. У другім салоне бачым тры невялікія карціны справа без усялякіх шанцаў нешта на іх разгледзець, а вось злева хутчэй за ўсё размяшчалася карціна Фры Барталамеа, аб гэтым сведчыць прыпіска, зробленая рукою на здымку «obraz Fra Bartolomeo». Гэта той самы салон, да якога прымыкаў скарбец, што таксама пазначана на здымку з Францыі як «wejscie do skarbca». З фатаздымкаў, пра якія ідзе гаворка, можна зрабіць таксама ацэначныя памеры саміх карцін, у першую чаргу суадносячы іх з праёмам дзвярэй, якія існуюць і сёння ў тым жа выглядзе. Хто захоча, зробіць для таго шмат, каб вярнуць салонам іх першародны выгляд. Падставы для гэтага знойдуцца, і немалыя.

Ужо зусім на апошніх старонках свайго манускрыпта Станіслаў Нямцэвіч раптам паведамляе пра вельмі неспадзява-

ныя і значныя абставіны лёсу некаторых скокаўскіх рарытэтаў: «Большасць сямейных памятных рэчаў у прадметах і дакументах, як і архіў Берасцейскага ваяводскага трыбунала, перад немцамі быў вывезены пад Калугу. Прапала ўсё разам з партрэтамі ў час рэвалюцыі 1917 года. Прапалі там паміж іншым: табакерка ад Паўла I, ордэны св. Станіслава, якія належалі Юльяну і генералу Станіславу, ордэн Virtuti Military Кароля, стосы рукапісаў Юльяна.., дакументы і каралеўскія дэкрэты, якія маюць народную каштоўнасць.»

Атрымаць Станіславу такую інфармацыю было ад каго, хутчэй за ўсё, як ён сам называе, ад цёткі Янавай, маці яго жонкі Яніны, Зоф'і з Мазарак, якая ўладкоўвала скокаўскай маёмасцю абоз, які адпраўляўся ў жніўні 1915 года ў «бежанцы» пад Калугу.

Знаходзім далей яшчэ адзін запіс у Станіслава Нямцэвіча: «Захаваліся ад знішчэння пасля Першай вайны нешматлікія памятныя рэчы, складзеныя ў банк у Кракаве. Сярод памятных рэчаў вялікая частка загінула ў маёнтку Цецяруўка, якая была там складзена жонкаю дзядзькі Яна. Там згубіліся: пераносны пісьмовы стол Юльяна, разнастайныя рукапісы Юльяна, шабля Юльяна з рыцарскай школы, падараваная яму братам, выбіты бронзавы медаль Зыгмунта III за ўзяцце Смаленска, успаміны генерала Панінскага ў рукапісе. Генерал быў напалеонаўскім салдатам, а потым італьянскім. Уратаванымі пасля Першай вайны засталіся карціны Барталамеа, два Тэнэрса, Бачыарэлі і два малюнкі алоўка Яна Мацейкі. Апроч таго – шмат саксонскага фарфору, бронзы і калекцыя манет.»

Вось такое жывое тлумачэнне даў у канцы сваіх успамінаў Станіслаў, шкода, што напрыканцы. Праўда, не зусім зразумела, дзе ж сёння знаходзіцца тое, што ацалела ад гэтых бясконцых войнаў. Але заўважым, калі каштоўнасці не перавышаюць разумных памераў, людзі, для якіх яны з'яўляюцца дарагімі, робяць усё магчымае, каб іх уратаваць. Іншымі словамі – усё не гіне, шукайце!

...Вернемся да размовы пра скарб, які быў знойдзены памежнікамі ў Бераставіцкім раёне на Гарадзеншчыне ў 1989 годзе. Каб не заставалася сумнення, каму належалі рэчы, знойдзеныя такім цудоўным і нечаканым выпадкам, звернемся зноў да Станіслава:

– Засталіся таксама ў Цэцяруўцы закапанымі два срэбраныя кубкі (з якіх адзін з манетамі быў падараваны майму брату), карціна Юльяна на шлюбе дзеда Тадэвуша і Андрэеў срэбраны буздыган з барэльефам бітвы пад Венай, праўдападобна, ахвяраваны яму землякамі пасля венскай неабходнасці. Частка лістоў і памятных рэчаў у гэтыя часы загінула таксама ў Скоках.

Шмат хто шукае сёння ў Беларусі старадаўнія скарбы. Можа, камусьці і шанцуе, але вось каб так скарб «вызваліўся» нечакана з пяску – гэта ўжо нешта містычнае, так і просіцца вымавіць:

– Нямцэвічы нагадваюць нам пра сваё вяртанне на сваю родную зямлю.

Адшукалася і больш дакладнае сведчанне пра клад Нямцэвічаў з Цецяруўкі, менавіта, непасрэднага удзельніка тых падзей. Ліст Ежы Ўрсын Нямцэвіча ад 28.01.1990 года з Францыі ў Польшчу растлумачвае шмат невядомага:

– *Шаноўны пан!*

*Сардэчна дзякую за ліст з дня 15 бягучага месяца, які я атрымаў. Не ведаю і не бачу, адкуль Вы атрымалі мой адрас, але шчыра ўзрушаны Вашым лістом і таксама тым, што тыя нашыя польскія і нямцэвічскія памятныя рэчы, якія закопвалі ў першых днях верасня 1939 года, адшукаліся зараз акурат праз 50 гадоў.*

*Былі яны закапаны ў маёнтку Цецяруўка (пошта Цецяруўка, станцыя Бераставіца, Гродзенскі павет), належалі вечнай памяці майму дзядзьку Ежы Ўрсын Нямцэвічу, а дакладна яго жонцы – цётцы Людвікі з Касакоўскіх. Закопвалі: дзядзька, яго сын Юзё (мой стрыечны брат), і я, без іншых сведкаў, і таму, напэўна, засталіся ўратаванымі. Меў тады ўсяго толькі 15 гадоў, і, пэўна, успамін можа быць не зусім дакладны. Ва ўсякім выпадку не ўбілася мне якаясь пяскоўня! Месцам «пахавання» быў малы лясісты пагорак сярод поля.*

*Вельмі шмат тых рэчаў належала вечнай памяці маёй маці Яніне, дачцэ Яна Ўрсын Нямцэвіча, жонцы майго бацькі Станіслава (сына Юльяна Ўрсын Нямцэвіча) брата Ежы. Найкаштоўнейшыя рэчы (булава, кубкі ...) – рэшткі скокаўскіх збораў, якія ў цэлым прапалі, будучы вывезенымі са Скокаў пад Брэстам дзесь пад Калугу ў час Першай вайны. Уласніцай*

*Скокаў пасля свайго бацькі была мая маці. Срэбра з гербам «Пагоня» паходзіць ад Чацвярцінскіх (бабка маёй маці). Зрэшты, лёгка спраўдзіць, таму што на «Пагоні» знойдзенага срэбра Св. Юрый праколвае змея кап'ём, на гербе ж Вялікага Княства Літоўскага маецца меч узнесены. Усе тыя рэчы былі ў 39-м годзе складзены ў дэпазіце ў Цецяруўцы, на што маю дзіўнай выпадкоўвасцю довады. Мая маці мела трох дзяцей: Марыю Тэрэсу (у Францыі), Кароля Ўрсын Нямцэвіча (у Канадзе) і мяне.*

*Жадаю таксама ўнесці надзейныя выпраўленні:*

*– О колькі памятаю, тую «булаву», сярэбраная, каваная, са значнымі меднымі жылкамі, з профілем вобраза караля Яна III, а не Зыгмунта Вазы. Была шанаванай, але без доказаў, за дар Сабескага Андрэю Ўрсын Нямцэвічу, аднаму з камандзіраў у дапамозе венскай. Ва ўсякім разе гэта была дэкаратыўная булава, а не звычайны ротмістраўскі буздыган.*

*– Значэнне гістарычнае маюць таксама:*

*– Кубак прэсаваны сярэбраны, на ім – шэсць сцэн з жыцця Хрыста, прынесены ў падарунак Юльянам У.Н. (аб чым пішацца ў адным з успамінаў – не памятаю дзе?) пляменніку Тадэвушу Ў.Н. у дзень шлюбу.*

*– Шабля Юльяна Ў.Н. Тая апошняя з'яўлялася ўласнасцю дзядзькі Юркі – падараваў яе яму мой дзед Ян. Аб той шаблі беларуская газета не ўпамінае, была ж яна закапаная разам з іншымі памятнымі рэчамі.*

*Якім бы ні быў далейшы лёс гэтай справы, належыць глядзець на цэласнасць, а не музею войска толькі «булаву» разам з іншымі ваеннымі рэчамі.*

*Копіі Вашага пісьма і майго адказу пасылаю да:*

*– дырэктара музея войска;*

*– аднаго з маіх кузэнаў у Варшаве.*

*Тым часам дзякую яшчэ раз. З пашанай*

*Ежы Ўрсын Нямцэвіч.*

Змест ліста прымушае звярнуцца да зместа кароткага артыкула «Тайна клада», які быў змешчаны у газеце «Гродненская правда» 26 жніўня 1989 года разам са здымкам знойдзеных рэчаў, на якім апроч сталовага срэбра і збана са срэбра добра распазнаюцца два кубкі і буздыган. Прывядзем змест артыкула на мове арыгінала поўнасцю:

– Да вряд ли там ценное что-то вырыли. Бабка моя сказывала: здешние паны небогатые были, – разочаровал один из сотрудников райотдела милиции, куда заехали уточнить местонахождение клада. Ничего, утешали себя по дороге, пусть и невелики ценности, да ведь далеко не каждый день земля «открывает» тайны прошедших лет. А главный хранитель Гродненского историко-археологического музея Светлана Петровна Полховская нас даже обрадовала: клад хоть по материальной ценности меньше других, найденных в последние годы, зато по исторической – один из самых интересных.

Музей сработал оперативно. Когда мы приехали, Полховская вместе с представителем райфинотдела Л. И. Сизовой «решали судьбу» находок. Опоздай хотя б на часок, и не увидеть всего в полном объеме.

Самая интересная из вещей – булава. Судя по рисункам и по тому, что выполнена из простого металла, специалист музея предположительно относит ее к XV-XVI столетиям. А тут еще обнаружился металлический знак с верхушки булавы с изображением, как предполагает Светлана Петровна, Сигизмунда Августа III.

Самая же броская находка – кубок из белого металла, украшенный польскими монетами XVI-XVIII веков, памятными медалями и камнями, среди которых не исключена возможность и ценных. Это определят специалисты. Как и то, что именно изображает барельеф на втором кубке. Полховская же предполагает, что речь идет о рождении наследника.

А вот туалетный кувшин и вазочка для мытья рук – точно серебряные. Проба есть.

Щиток с гербом, польские знаки отличия, а в основном столовое серебро: ножи, вилки, ложки, на ручках которых одно и то же изображение – всадник на лошади. Всего найдено 86 предметов, часть из которых пойдет в музей.

Кстати, в будущем году историко-археологический музей организует выставку кладов, найденных на территории области. За последнее время обнаружено четыре, три из них – в Щучинском районе.

Вместе с берестовицким кладом найдены документы. Бумага плохо сохранилась, но кое-что прочитать удалось сразу.

«Немцевич Урсын Ежи»... По всей вероятности, он был владельцем ценностей.

А как нашли клад? Повезло пограничникам ефрейтору Николаю Каленчуку и рядовому Вячеславу Костецкому. Понадобился песок из карьера (кстати, разработка его ведется давно), стали копать и наткнулись на ружейные стволы. Копнули дальше – нашли ящичек, который раскрошился, как только дотронулись. А содержимое его и все остальное – привезли, чтобы сдать в музей.

(Артыкул да друку падрыхтавала А. Ленская, здымак скарбу зрабіў В. Выдзерко.)

З такім вось фіналам, але з нявызначаным да канца лёсам застаецца гэтая справа. А нам, тым хто жыве сёння ў Беларусі, зрэшты, застаецца магчымасць з пашанай аднесціся да таго, што завецца айчыннай спадчынай. Няхай не адразу ўсё атрымаецца, але кропля камень точыць...

**Калужскі след**

Падказка гісторыка-даследчыка з Пінска Аляксандра Ільіна, што нешта са спадчыны Нямцэвічаў знойдзена ў Калужскім мастацкім музеі, аказалася вельмі трапнай.

Насамрэч, публікацыі, на якія звярнуў увагу намеснік дырэктара Калужскага мастацкага музея Васіль Пуцко, высвечвалі нечаканы пазітыў на тое, што лічылася безнадзейна загубленым, менавіта, выявілася, што не ўсе карціны са скокаўскай сямейнай галерэі растварыліся і загінулі ў полымі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў Расіі. І. В. Гужава ў сваім артыкуле «Несапраўдны партрэт Ю. А. Нелядзінскага-Мелецкага» ў «Зборніку Калужскага мастацкага музея» за 1993 год, сапраўды інтрыгуючы, паведаміла:

– Па дадзеных Дзяржаўнага архіву Калужскай вобласці ў Калужскую губерню ў перыяд з 1914 па 1917 гады былі вывезены архівы і іншая маёмасць з польскіх губерняў, у прыватнасці з Брэст-Літоўска. Сярод эвакуіраваных каштоўнасцяў аказаліся карціны, якія пасля праведзенай у 1918 годзе канфіскацыі, трапілі ў музейны фонд Губмузея і толькі што адкрытага мастацкага музея. Па спісах Губмузея, мастацкага і гістарычнага музеяў праходзяць 15 яўна польскіх партрэтаў. Сярод іх ёсць

партрэты вызначаных асобаў: Нямцэвіча, стольніка віцебскага, Ядвігі Нямцэвіч, Марцэла (Мерцэля) Нямцэвіч, Аляксандра Нямцэвіча, партрэт дзяцей Нямцэвіча (Дзяржаўны архіў Калужскай вобласці, ф. Р-32, оп. 1, д. 8, л. 42. Опіс уліковай дакументацыі аддзела фондаў КОКМ. Інвентарная кніга № 4, с. 71, 72; інвентарная кніга № 4, №№ 249, 374, 388, 377, 495).

Не кранаючы той акалічнасці, што Брэст-Літоўск ніколі да польскіх губерняў не адносіўся, таму што ён быў заўсёды Брэст-Літоўск, падзякуем шчыра спадарыні І.В.Гужавай за вельмі трапную і цікавую інфармацыю. Не патрэбна быць Шэрлакам Холмсам, каб асмеліцца меркаваць, што сапраўды ў прыведзеным спісе ёсць тыя партрэты, якія належалі да 1915 года да сямейнай галерэі Нямцэвічаў у скокаўскім палацы. Параўнаем прыведзены вышэй пералік з інфармацыяй, якую дае ў сваім манускрыпце «Маім унукам» Станіслаў Нямцэвіч, а менавіта:

– Нямцэвіч, стольнік віцебскі – гэта хутчэй за ўсё «Андрэй у чырвоным кунтушы», які насамрэч меў ганаровы тытул віцебскага стольніка;

– Ядвіга Нямцэвіч – тут супярэчнасці ніякай не бачна, таму што такі партрэт значыўся ў скокаўскай калекцыі – Ядвіга з Сухадольскіх, жонка Марцэля – гэта маці знакамітага Юльяна;

– Марцэла (Мерцэля) Нямцэвіч – бясспрэчна, што гаворка можа ісці толькі пра Марцэля Ўрсын Нямцэвіча – бацьку Юльяна Нямцэвіча, будаўніка палаца ў Скоках, які менавіта і заснаваў гэтую самую сямейную карцінную галерэю ў Скоках;

– Аляксандр Нямцэвіч – пра такі партрэт Станіслаў Нямцэвіч не ўспамінае, не называе яго і сам Юльян у сваіх «Успамінах», але ён абазначаны на здымку сталовай залы. Калі тут няма памылкі, то гэта можа быць хутчэй за ўсё дзед Юльяна – Аляксандр Нямцэвіч, яшчэ Аляксандрам звалі сына малодшага брата Юльяна Каэтана, іншых Аляксандраў сярод Нямцэвічаў не было, калі не лічыць у больш ранняй генерацыі брата Андрэя, віцебскага стольніка, пра якога зусім нічога невядома;

– партрэты дзяцей Нямцэвічаў – вельмі неакрэслена, каб рабіць нейкія здагадкі.

Прынамсі, тое, што здавалася безнадзейна страчаным, мае сёння рэальны шанец, калі адбудзецца аднаўленне палаца, упры-

гожыць палац арыгіналамі альбо копіямі захаваных партрэтаў са Скокаў, але гэта ўжо ёсць праца мастаўцазнаўцаў-даследчыкаў. Працуйце хлопцы і дзяўчаты на будучыню нашай гістарычнай памяці, толькі не блефуйце аргументам, што гэтыя скарбы хтось украў са Скокаў. Нічога блізкага да гэтага не было, яны сваім ходам на калёсах прыехалі да Калугі – так склаліся абставіны таго разбуральнага для нас 1915 года. Махаць паперамі ў паветры няма патрэбы, а вось абодвум бакам уважліва і добразычліва аднесціся і да тых абставін, і да сённяшніх рэалій – было б добрым падарункам будучым пакаленням. Вось тады гістарычны сэнс справядлівасці і адбудзецца.

Артыкул спадарыні І. В. Гужавай прысвечаны высвятленню блытаніны з іншым партрэтам, на якім, як лічылася, быў намаляваны рускі паэт пачатку XIX стагоддзя Юрый Аляксандравіч Нелядзінскі-Мелецкі. Зрабіўшы дэталёвы прафесійны аналіз, І. В. Гужава паведамляе: «У зборы Нацыянальнага музея ў Варшаве знаходзіцца партрэт сталага мужчыны ў бекешы з футравым каўнерам, які сядзіць за сталом з кніжкаю ў руцэ. У левай верхняй частцы кампазіцыі карціны напісана на латыні імя намаляванага і яго ўзрост на момант напісання партрэта. У правай частцы кампазіцыі каля правага рукава подпіс аўтара – ініцыялы «АВ» і дата – 1820. Гэта партрэт Юльяна Ўрсын Нямцэвіча, напісаны Антоні Станіславам Брадоўскім у 1820 годзе, калі Юльяну споўніўся 61 год.»

Далей І.В.Гужава піша: «Параўнанне двух партрэтаў з Калугі і Варшавы паказвае, што калужскі партрэт з'яўляецца паменшанай копіяй з партрэта Нямцэвіча са збору музея ў Варшаве. У калужскім варыянце мастак абмежаваўся пагрудным адлюстраваннем мадэлі.» Аўтар артыкула паведамляе таксама, што гэты партрэт, як і іншыя мог трапіць у калужскі музей у 1918-1920 гадах. А копія з арыгіналу гэтага партрэта «была ў маёнтку Нямцэвіча Скокі пад г. Брэст-Літоўскам і знікла ў Першую сусветную вайну».

І. В. Гужава спасылаецца тут на польскую крыніцу 1971 года. Можа быць і так. Але чаму тады пільны А.Краўшар, які быў у скокаўскім палацы перад 1914 годам, не заўважыў такі прэзентабельны і вядомы партрэт Юльяна Нямцэвіча ў Скоках, а прыводзіць фотарэпрадукцыю зусім іншага яго партрэта, які на-

самрэч захоўваўся ў Скоках. Нічога не ўдакладняе і Станіслаў Нямцэвіч, які наведваў шматразова скокаўскі палац перад Першай сусветнай вайною, ён проста называе адзіны партрэт Юльяна, верагодна, той, фотарэпрадукцыю якога зрабіў А. Краўшар. Праўда, трэба заўважыць, што дэталёвага інвентару скокаўскай сямейнай карціннай галерэі ўвогуле не існавала, таму меркаваць можна рознае. Але ўсе роўна паўстае пытанне, чаму гэта А. Краўшар не прыкмеціў такога вядомага палатна ў Скоках?

Хацеў бы адразу ж заўважыць аматарам крытыкаваць, што менавіта, дзякуючы публікацыям супрацоўнікаў Калужскага мастацкага музея, з'явіліся аргументы для размовы пра скокаўскія партрэты. Дагэтуль наогул такая тэма не дыскутавалася, таму, не здабываючы таннай славы, паспрабуем абмежавацца параўнаннем інфармацыі з акрэсленых вышэй крыніц з той, якая з'явілася ў зборніку «Вяртанне» Беларускага фонда культуры пад нумарам шэсць у 1999 годзе. Артыкул калужскіх мастацтвазнаўцаў Васіля Пуцко і Галіны Сафронавай «Калужскія партрэты з сядзібы Нямцэвічаў у Скоках на Брэстчыне» на беларускую мову пераклала Ірына Тамільчык. Аўтары не пераканаиы ў дакладным лёсе прыведзенага спісу мастацкіх каштоўнасцяў, але, прыводзячы яго, выказваюць надзею, што гэты матэрыял можа заахвоціць даследчыкаў і нейкім чынам садзейнічаць выяўленню твораў, якія доўгі час заставаліся невядомымі.

23 карціны, спіс якіх дакладна прыводзіцца з вышэйназванага артыкула, у 1922 годзе з Калужскага губернскага музея паступілі ў Калужскі гістарычны музей, які быў адкрыты ў лістападзе таго ж года, а ў 1925 годзе – пératвораны ў Калужскі абласны дзяржаўны музей. Звесткі прыведзены ў адпаведнасці з інвентаром кнігі № 4 уліку экспанатаў гэтага музея:

1. № 341. Партрэт Уладзіслава IV. Х., м. 70×52. Выключаны 21.03.1959 (ордэр № 1397).;
2. № 355. Партрэт невядомага са стужкай Белага арла. Х., м. 70×52. Выключаны паводле акту 14.04.36 і па ордэры 21.03.1959 г.;
3. № 356. Партрэт Станіслава Панятоўскага. Х., м. 64×49. Выключаны паводле акту 19.04.1936 г.;
4. № 370. Партрэт невядомага паляка. Х., м. 48×32. Выключаны ў 1936 г.;

5. № 371. Партрэт Баляслава Харобрага. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.;

6. № 372. Партрэт Яна Казіміра. Выключаны 19.04.1936 г.;

7. № 374. Партрэт Нямцэвіча, стольніка віцебскага. Выключаны 19.04.1936 г.;

8. № 375. Партрэт Ядвігі Сухадольскай. Выключаны 19.04.1936 г.;

9. № 376. Партрэт Жалкеўскага. Х., м. 65×51. Выключаны 21.03.1959 г.;

10. № 377. Партрэт Аляксандра Нямцэвіча. Х., м. 87×69. Выключаны 19.04.1936 г.;

11. № 379. Партрэт Сігізмунда Аўгуста. Х., м. 64×51. Выключаны 19.04.1936 г.;

12. № 384. Партрэт польскай каралевы Кацярыны. Х., м. 63×50. Выключаны 19.04.1936 г.;

13. № 388. Партрэт Марцэлія Нямцэвіча. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.;

14. № 390. Партрэт папы Пія VIII. Х., м. 63×52. Захаванасць дрэнная, шмат восыпу;

15. № 393. Партрэт Станіслава Каняцпольскага. Х., м. Выключаны;

16. № 378. Партрэт Стэфана Баторыя. Х., м. Выключаны паводле акту інвентарызацыі 19.04.1936 г.;

17. № 401. Партрэт невядомага паляка. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.;

18. № 403. Партрэт невядомага з ордэнам Белага арла. Х., м. 65×56. Выключаны 19.04.1936 г.;

19. № 495. Партрэт дзяцей Нямцэвіча. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.;

20. № 563. Партрэт невядомага паляка ў чырвоным. Х., м. 54×39. З сядзібы Корабавых. Выключаны 19.04.1936 г.;

21. № 567. Партрэт невядомага паляка ў брані. Выключаны 19.04.1936 г.;

22. № 605. Партрэт невядомай каталіцкай асобы. Выключаны 19.04.1936 г.;

23. Б/н. Партрэт невядомага з ордэнам Уладзіміра; (№ 606). Х., м. Выключаны 21.03.1959 г.

Амаль усе партрэты пазначаны словам «Выключаны...» і, як заўважаюць аўтары, «былі асуджаны на знішчэнне, але фактычна знішчаны не ўсе».

Аўтары толькі мяркуюць, што карціны хутчэй за ўсё маглі быць вывезены з сядзібы Нямцэвічаў у Скоках, але на гэты конт дакладных звестак не маюць. Падкрэсліўшы «забыўлівасць» Беларусі ў адносінах да сваіх каштоўнасцяў, аўтары паведамляюць, што ў 1959 годзе Калужскі краязнаўчы музей «у парадку пераразмеркавання фондаў» з гэтага спісу па просьбе Міністэрства культуры БССР 5 твораў перадаў у Гродзенскі музей, фотаздымкі якіх аўтарам пры падрыхтоўцы гэтага артыкула ў 1999 годзе з Гродна атрымаць не ўдалося. Да гэтых 5 карцін, перададзеных у Гродна, адносяцца наступныя з прыведзенага спісу: 2, 23, 1, 9 і «партрэт невядомага з сінім бантам».

Калі правесці параўнальны аналіз прыведзенага спісу карцін з тым, што згадваюць Аляксандр Краўшар і Станіслаў Нямцэвіч адпаведна ў «Крохах мінуўшчыны» і ў «Маім унукам», то першае, што кідаецца ў вочы, – гэта вельмі доўгі і вельмі стракаты пералік мастацкіх твораў у артыкуле «Калужскія партрэты з сядзібы Нямцэвічаў у Скоках на Брэстчыне», пра якія ніхто і ніколі дагэтуль не ўпамінаў, уключаючы і самога Юльяна Нямцэвіча, які ва «Успамінах часоў маіх» упамінае дзве карціны-копіі Карло Дольчы «Госпадзь Ісус» і «Матка Божая», якія віселі ў зале яшчэ ў старым драўляным доме ў Скоках і называе яшчэ два партрэты, менавіта, караля Яна Сабескага і яго жонкі ў Клейніках у дзедаўскім доме, а таксама партрэт свайго прапрадзеда Казіміра Нямцэвіча, стольніка вялікамірскага, «дзеда дзеда майго, які стаіць на каленях». Не маючы магчымасці да больш дасканальнага аналізу, акрэслім толькі яго вонкавыя праяўленні. Род Нямцэвічаў, вядомы з сярэдзіны XV стагоддзя, безумоўна, меў час і сродкі набыць вельмі багатую і старажытную калекцыю карцін, але добра вядома, што ніхто з іх такім аматарам не быў. Сам Юльян Нямцэвіч заўважае: «Я не бачу ў родзе маім ні гетманаў, ні канцлераў, ні прымасаў. Былі гэта людзі заможныя, сумленныя, не славалюбівыя, выконвалі бездакорна грамадзянскія павіннасці, былі дэпутатамі, ішлі на войны, гінулі на іх, зрэшты, як і тысячы іншых, жаніліся, нараджалі

дзяцей, вялі гаспадарку, паміралі без папрокаў. Хай асвяціць Бог іх душы!»

Гэтых слоў дастаткова, каб зразумець, што ніхто з Нямцэвічаў насамрэч не вылучаўся здольнасцямі да самазадаволенага збору партрэтаў вядомых тагачасных дзеячаў. Аб гэтым сведчыць і фотаздымак сталовай залы ў Скоках перад Першай сусветнай вайной, дзе пералік партрэтаў абмяжоўваецца лічбай адзінаццаць. Марцэлі Нямцэвіч, які заснаваў карцінную галерэю ў Скоках, меў два асноўныя захапленні, а менавіта – гаспадарку і рэлігію. Не мелі асаблівага захаплення да збору партрэтаў вядомых асобаў і наступныя гаспадары скокаўскага палаца.

Гэта і шмат якіх іншых дробязяў даюць падставы меркаваць, што скокаўская карцінная галерэя складвалася ў асноўным з сямейных партрэтаў продкаў Нямцэвічаў і саміх гаспадароў палаца, і не прэтэндуе на больш значны ўзровень, таму тыя пяць карцін, якія апынуліся ў Гародні, хутчэй за ўсё ніякіх адносінаў да Скокаў не мелі. Гэтае самае, імаверна, можна аднесці і да большасці твораў, пералічаных у прыведзеным спісе з артыкула калужскіх мастацтвазнаўцаў. Але пяць з іх не выклікаюць ніякіх сумненняў, што да 1915 года знаходзіліся менавіта ў Скоках:

7. № 374. Партрэт Нямцэвіча, стольніка віцебскага. Выключаны 19.04.1936 г.;

8. № 375. Партрэт Ядвігі Сухадольскай. Выключаны 19.04.1936 г.;

10. № 377. Партрэт Аляксандра Нямцэвіча. Х., м. 87×69. Выключаны 19.04.1936 г.;

13. № 388. Партрэт Марцэля Нямцэвіча. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.;

19. № 495. Партрэт дзяцей Нямцэвіча. Х., м. Выключаны 19.04.1936 г.

Звернемся яшчэ раз да артыкула, змешчанага ў зборніку «Вяртанне». У ім паведамляецца, што разам з пяццю партрэтамі ў Гродна з Калугі былі ў той час перададзены яшчэ «бронзавыя партрэты-медальёны ў драўляных рамках Нямцэвіча (інв. № 1062) і Чартарыйскага (інв. № 1063), а таксама шабля 1863 г. з металічным эфесам, аздобленым выявай рыцарскіх даспехаў (інв. № 1279)».

Далей у артыкуле характарызуюцца толькі тыя партрэты з названай серыі, «якія цяпер захоўваюцца ў Калузе» і былі выяўлены ў фондах абласнога краязнаўчага музея:

– На першым партрэце (інв. № 4460/2, пам. 64×51, вядомы пад № 379) – нагрудная выява польскага караля Сігізмунда II Аўгуста (1548-1572). На адваротным баку партрэта – наклейка з фамільным гербам Урсын Нямцэвічаў і наступным абазначэннем у два радкі: Z Zbiora Xiąg/Jul. Ursin Niemcewicza;

– Стэфан Баторый прадстаўлены на другім партрэце (інв. № 4460/4, пам. 65×52, раней вядомы пад № 378)... (аб наклейках альбо паметках, каму ён належаў гаворка тут не ідзе);

– на трэцім партрэце (інв. № 4460/3, пам. 63×52, раней вядомы пад № 390) паўфігурная выява папы рымскага Пія VIII (звестак, каму ён мог належаць, таксама няма);

– на чацвёртым партрэце (інв. № 4460/1, пам. 72×60, раней вядомы пад № 401) паказаны невядомы шляхціч, магчыма, з сям'і Нямцэвічаў... Паголены мужчына – у гадах, з закручанымі ўверх вусамі... (звестак аб прыналежнасці партрэт таксама не мае);

– апошні, пяты партрэт (інв. № 1211, пам. 56×47, раней вядомы пад № 388), уяўляе сабой палатно без падрамніка. У музейных інвентарах лічыўся «Партрэтам афіцэра XVIII ст.». На ім прадстаўлены пагрудна, у трохчацвёртным павароце ўправа, малажавы шляхціч з вусамі, у вопратцы, характэрнай для апошняй чвэрці XVIII ст. На адваротным баку палатна – трохрадковы суправаджальны надпіс: Marcelli Ursin Niemcewicz / Padczaszy Wojewodztwa Podlaskiego / R. P. 1785.

Пазначаную дату можна лічыць часам напісання партрэта, які, у адрозненне ад папярэдніх, з'яўляецца арыгіналам выявы падчашага Падляшскага ваяводства Марцэля Ўрсын Нямцэвіча, бацькі Юліяна Ўрсын Нямцэвіча – вядомага польскага пісьменніка-публіцыста. Марцэлі памёр у 1802 г.

Пазней фотаздымак гэтага пятага партрэта з'явіўся ў беларускай газеце «Голас Радзімы» ад 31 мая 2000 года ў артыкуле Васіля Пуцко «Калужскія знаходкі».

Партрэту Марцэля Ўрсын Нямцэвіча ў гістарычным сэнсе моцна пашанцавала: менавіта ён, прынамсі, тры разы быў надрукаваны. Першы раз Аляксандрам Краўшарам у кніжцы «Okruchy Przeszlości» на старонцы 243, выдадзенай у Варшаве і Кракаве ў 1913 годзе, прычым гэтая фотарэпрадукцыя была зроблена непасрэдна ў скокаўскім палацы з арыгіналу. Другі раз партрэт Марцэля

Нямцэвіча з'явіўся ў «Pamiętnikach czaców moich» Юльяна Ўрсын Нямцэвіча на ўстаўцы да старонкі 48 у першым томе разам з фотарэпрадукцыяй партрэта Ядвігі з Сухадольскіх, маці Юльяна. Кніга была выдадзена ў Варшаве ў 1957 годзе. Праўда, рэпрадукцыі ў гэтым выданні былі зроблены з копій партрэтаў, якія знаходзяцца ў Народным музеі ў Варшаве. І нарэшце трэцяя фотарэпрадукцыя з'явілася ў 2000 годзе ў газеце «Голас Радзімы» па ініцыятыве калужскіх мастацтвазнаўцаў, зробленая зноў з арыгіналу, які цяпер знаходзіцца ўжо ў Калузе.

Без нейкай ненаўмыснай міфічнасці звычайнага партрэта звычайнага берасцейскага шляхціча паразуменне ў гэтай гісторыі знайсці цяжка. Памяць аб прыстойным, людскім родзе Нямцэвічаў так і імкнецца вярнуцца да Скокаў, якія Марцэлі ўласна зрабіў радзінным гняздом. Сёння толькі яго палац у Скоках, пабудаваны яшчэ ў 1770-х гадах, мае выяву і дух таго ўжо далёкага часу. Нешта вышэйшае тут падштурхоўвае нас да пазітыўнага выніку.

Подпіс на адвароце партрэта польскага караля Сігізмунда II Аўгуста «Z Zbiora Xiąg/Jul. Ursin Niemcewicza» схіляе да падказкі на тое, што адзіны раз у сваім жыцці пасля напалеонаўскага панавання Юльян купляе каля Варшавы (сёння гэта Варшава) фальварак Роскаш, які называе Ўрсынаў. Ён вельмі ганарыўся гэтай сваёй адзінай у яго складаным жыцці маёмасцю і добра яе ўладкаваў, магчыма, і каштоўнымі карцінамі, якія мог набыць, як сакратар сената. Але гэтае «гняздо» Юльян павінен быў пакінуць у час паўстання 1830 года і больш сюды ўжо не вярнуўся. Пасля паўстання маёнтак Урсынаў быў канфіскаваны і падараваны генералу Вінцэнцію Красінскаму «за вернасць». Сваякі Красінскага, да якога мог перайсці гэты маёнтак па спадчыне, прапанавалі Яну Тытусу Ўрсын Нямцэвічу са Скокаў дзесь пры канцы XIX стагоддзя маёнтак адкупіць, на што той адказаў:

– Што задарам атрымаў, тое можаш толькі дарам аддаць.

Але нягледзячы на такі катэгарычны адказ, Ян Тытус, які ў той час займаў высокую дзяржаўную пасаду ў Расійскай імперыі, мог на нейкіх умовах забраць з Урсынава памятныя рэчы Юльяна, уключаючы і карціны, і перавезці іх да Скокаў, дзе ён тады жыў. Але гэта толькі меркаванне магчымых фартэляў гісторыі,

патрабуецца крапатлівая праца, каб нешта давесці да фінішу. Пагодзімся толькі з тым, што ўсё ж харызма Марцэля ва ўсёй гэтай справе прысутнічае і заклікае насамрэч да вяртання каштоўнасцяў на сваю радзіму ў Скокі каля Берасця.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Niemcewicz U.J. Pamietniki czasow moich. Warszawa, 1957.
2. Niemcewicz U.S. Moim wnukom. Manuskrypt, 1979.
3. Niemcewicz U.W. Miscellanea oraz wspomnienia wlasne dotyczace Niemcewczow. Czesc II. Manuskrypt, 1997.
4. Пуцко В. Калужскія партрэты з сядзібы Нямцэвічаў у Скоках на Брэстчыне / В. Пуцко, Г. Сафонава // Вяртанне-6. Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах / Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны ; Бел. фонд культуры ; рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 1999. – С. 274-281. – (Вяртанне ; вып. 6).
5. Гладышчук А.А. Гістарычны цень на скокаўскім палацы / А.А. Гладышчук // Вечерний Брест. – 2004. – 26 сакавіка (№ 24). – С. 4.
6. Kraushar A. Okruchy Przeszlosci. Warszawa i Krakow, 1913.
7. Гладышчук А.А. Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі. Мінск (у друку).